УДК 930 (476)

**І.У. Нікалаева**

# Савецкая гістарыяграфія становішча жанчын Беларусі ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны

Гісторыя жанчын у беларускім грамадстве перыяду Вялікай Айчыннай вайны таксама, як і многія іншыя пытанні айчыннай гісторыі, доўгі час не мела аб'ектыўнага адлюстравання. Прынцып адмаўлення самастойнага статусу жаночых праблем, якім на працягу многіх дзесяцігоддзяў кіравалася савецкая дзяржава, у многім быў перанесены і ў сферу навуковых даследаванняў па гісторыі жанчын. У кантэксце развіцця ў сучаснай нацыянальнай гістарычнай навуцы жаночых і гендэрных даследаванняў паўстала неабходнасць пераасэнсавання ідэалагічных прыярытэтаў і метадалагічных падыходаў, што усталяваліся ў гістарыяграфіі абазначанай тэмы. У гэтай сувязі ўяўляецца патрэбным звярнуцца да аналізу савецкай гістарыяграфічнай традыцыі ў дачыненні да праблем становішча жанчын Беларусі ва ўмовах Вялікай Айчыннай вайны.

Як сведчыць аналіз апублікаванай літаратуры, асэнсаванне і распрацоўка пытанняў ролі жанчын у барацьбе савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачаліся ўжо ў гады вайны [1]. Выданні гэтага перыяду невялікія па аб'ёме і маюць ў асноўным нарысавы, публіцыстычны характар. Галоўнае іх прызначэнне – мабілізацыя жанчын на актыўную барацьбу з захопнікамі. Зразумела, літаратура ваеннага часу не магла змяшчаць глыбокіх абагульненняў і вывадаў, яе каштоўнасць заключаецца ў першапачатковым назапашванні фактаў.

Даследаванню вызначанай праблемы ў пасляваеннае дзесяцігоддзе садзейнічаў выхад у свет у саюзных выдавецтвах навукова-папулярных прац і брашур аб патрыятызме савецкіх жанчын у мінулай вайне, у якіх уводзіўся ва ўжытак беларускі матэрыял. Айчынная гістарыяграфія першых пасляваенных гадоў прадстаўлена публікацыямі ў перыядычным друку, у якіх прыводзяцца яркія прыклады баявога і працоўнага подзвігу жанчын Беларусі [2]. Працам гэтага перыяду уласцівы недахопы, звязаныя з абмежаванай крыніцазнаўчай базай, ілюстрацыйнасцю і дэкларатыўнасцю выкладання. Асноўная ўвага ў іх сканцэнтравана на асвятленні героіка-патрыятычнага боку праблемы, кіруючай ролі партыі ў самаахвярнай барацьбе савецкіх патрыётак супраць германскіх агрэсараў.

Тую ж накіраванасць захавалі даследаванні па гісторыі «вырашэння жаночага пытання» ў СССР, што выйшлі ў свет у другой палове 50-х – 60-я гады. Сярод прац такога кшталту неабходна адзначыць брашуру айчыннай даследчыцы А.П. Ус «Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя жанчынам Беларусі» [3]. У ёй аўтар у форме папулярнага нарыса з прыцягненнем некаторых лічбавых даных і канкрэтных эпізодаў ваенна-баявой і працоўнай актыўнасці беларускіх патрыётак паказвае ўзрастанне ролі савецкіх жанчын ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вытокі масавага гераізму жанчын, па вызначэнні даследчыцы, заключаюцца ў самім сацыялістычным ладзе, які распрыгоніў іх і зрабіў раўнапраўнымі грамадзянамі Дзяржавы Саветаў.

Трэба заўважыць, што дадзеная ўстаноўка, уведзеная ў абсалют афіцыйнай савецкай гістарыяграфіяй, характэрна для большасці даследаванняў беларускіх навукоўцаў, якія выйшлі і ў наступныя гады. Аднак пры ацэнцы гэтых прац неабходна зыходзіць з умоў, у якіх яны былі напісаны. Пастаянны ідэалагічны кантроль з боку партыйных структур і безальтэрнатыўнае панаванне ў савецкай гістарыяграфіі марксісцкай метадалогіі абмяжоўвалі навукоўцаў у выбары аспектаў даследавання, падборы і аналізе фактычнага матэрыялу. Багатая факталогія звычайна выкарыстоўвалася для доказу ідэалагічна зададзеных вывадаў. Зразумела, што такі падыход стрымліваў развіццё навуковага даследавання гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў цэлым і вёў да спрошчання ўспрымання яе асобных праблем, сярод якіх асаблівае месца займала становішча жанчын у ваенны перыяд.

Кола навуковых даследаванняў па пытаннях патрыятызму савецкіх жанчын у Вялікай Айчыннай вайне значна пашырылася ў 1970-1980 гг. У плане праблемы, якую мы разглядаем, звяртае на сябе ўвагу манаграфія В.С. Мурманцавай «Советские женщины в Великой Отечественной войне: 1941-1945» [4]. У ёй аўтар на аснове прыцягнення разнастайнага фактычнага матэрыялу і асабістага вопыту паказвае ролю савецкіх жанчын у абароне Айчыны, іх самаадданую працу ў тыле, гераізм на фронце, партызанскіх атрадах і падполлі. Значнае месца ў змесце манаграфіі займае матэрыял пра беларускіх жанчын і ўраджэнак Беларусі. У раздзеле «Борьба женщин на захваченной врагом территории» аўтар аналізуе мабілізацыйную і арганізатарскую работу КПБ сярод жанчын рэспублікі ў пачатковы перыяд вайны, прыводзіць дадзеныя аб колькасным складзе жанчын у партызанскіх атрадах, камсамольскім і партыйным падполлі Беларусі. Манаграфія В.С. Мурманцавай уяўляе сабой першую працу, якая ў агульнасаюзным маштабе аналізуе ўклад савецкіх жанчын у перамогу. Аднак, нягледзячы на вялікую каштоўнасць і навуковую значнасць манаграфіі, аўтар не здолела пазбавіцца штампаў і стэрэатыпаў, што усталяваліся ў савецкіх даследаваннях па гісторыі жанчын. Пытанні, звязаныя са становішчам жаночага насельніцтва ў ваенны час, трактуюцца толькі з пазіцыі героікі тых дзён, без аналізу праблем і складанасцей, з якімі прыходзілася сутыкацца жанчынам у паўсядзённым жыцці. Па-за ўвагай даследчыцы засталіся памылкі і пралікі савецкай улады па выкарыстанні жанчын ва ўзброеных сілах і ў тыле. У кнізе аналізуецца толькі станоўчы вопыт, што абумовіла аднабаковы падыход да распрацоўкі тэмы.

У святле даследуемай праблемы заслугоўваюць увагі падрыхтаваныя на агульнасаюзным матэрыяле публікацыі А.В. Мітрафанавай і Н.І. Кандаковай [5-6]. Аўтары звяртаюцца да аналізу дзейнасці жанчын у розных рэгіёнах краіны, у тым ліку Беларусі, а таксама разглядаюць асноўныя накірункі арганізацыйнай і ідэйна-палітычнай работы партыйных органаў сярод розных катэгорый жаночага насельніцтва. Як і іншыя савецкія гісторыкі, даследчыцы не імкнуцца выявіць адмоўныя бакі палітыкі бальшавікоў у дачыненні да жанчын у надзвычайных умовах вайны. Метады камандна-адміністрацыйнай сі-

стэмы па ўцягненні жанчын у прамысловасць і грамадска-палітычнае жыццё характарызуюцца як адзіна верныя.

Вялікую ролю ў актывізацыі даследчай дзейнасці па гісторыі жанчын Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны адыгралі рашэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб абвяшчэнні 1975 г. Міжнародным годам жанчын. З другой паловы 70-х гг. у навуковых зборніках і перыядычным друку з'явіўся шэраг артыкулаў айчынных гісторыкаў, прысвечаных праблемам удзелу жанчын рэспублікі ў мінулай вайне. Так, у публікацыі Г. Грабёнкінай [7] асноўная ўвага сканцэнтравана на асвятленні ваенна-патрыятычнага руху жанчын рэспублікі ў гады вайны. Даследчыца прыводзіць канкрэтныя прыклады дзейнасці беларускіх патрыётак, якія змагаліся на фронце і ў партызанскіх фарміраваннях, дзейнічалі ў партыйным і камсамольскім падполлі. В. Протчанка ў сваім артыкуле [8] аналізуе некаторыя формы і метады арганізацыйнай і масава-палітычнай работы беларускіх партыйных арганізацый па далучэнні жанчын да партызанскага і падпольнага руху. Прыводзіць цікавы фактычны матэрыял па пытаннях падрыхтоўкі партызанскіх кадраў з ліку жанчын на кіруючыя пасады. Праца Э. Языковіч [9], напісаная з выкарыстаннем матэрыялу Партархіва пры ЦК КПБ і рэспубліканскага перыядычнага друку, закранае разнастайныя бакі дзейнасці жанчын рэспублікі ў гады ваеннага канфлікту. Аўтар уводзіць у навуковы абарот матэрыял аб удзеле беларускіх жанчын і ўраджэнак Беларусі ў еўрапейскім руху Супраціўлення. Багаты фактычны матэрыял па гісторыі гераічнай барацьбы жанчын рэспублікі прадстаўлены ў артыкуле Р. Чарнаглазавай [10], падрыхтаваным на аснове дакументаў, выяўленых даследчыцай у фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Вызначальнай рысай гэтых публікацый з'яўляецца адсутнасць глыбокіх навуковых абагульненняў і вывадаў, перавага факталагічнага матэрыялу замест яго грунтоўнага асэнсавання і аналізу. Стэрэатыпы мыслення, дапушчальны ўзровень галоснасці, цяжкасці з доступам да архіўных матэрыялаў не дазволілі іх аўтарам дамагчыся аб'ектыўнага паказу становішча жанчын ва ўмовах вайны.

У рамках савецкай гістарыяграфічнай традыцыі вытрымана і брашура айчыннай даследчыцы В.І. Ваньшынай [11], падрыхтаваная ўжо ў 1989 г. У ёй аўтар толькі абагульняе разгрупаваны па іншых публікацыях фактычны матэрыял аб гераізме жанчын рэспублікі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскім і падпольным руху Беларусі, што не дазволіла пазбегнуць апісальнага падыходу ў раскрыцці абранай праблемы.

Асобныя аспекты разглядаемай намі тэмы закраналіся беларускімі даследчыкамі на працягу 50-80-х гг. XX стагоддзя ў сувязі з работай над іншымі пытаннямі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Шматлікія прыклады дзейнасці асобных падпольшчыц і партызанак з ліку моладзі змяшчаюцца ў працах І.С. Краўчанкі, П.П. Ліпілы. Уклад жанчын у эканамічны патэнцыял краіны ваеннага часу, працоўная дзейнасць беларусак і ўраджэнак Беларусі, эвакуіраваных у савецкі тыл, разглядаюцца ў абагульняючых даследаваннях Г.І. Аляхновіч. У.І. Лемяшонак прааналізаваў ідэйна-палітычную работу КПБ сярод жаночага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Сярод навуковых даследаванняў гэтага перыяду асаблівай увагі заслугоўваюць працы А.І. Залескага. У іх аўтар у кантэксце абранай тэмы звяртаецца да праблем паўсядзённасці і быту сельскіх жанчын у партызанскіх краях і зонах, разглядае трансфармацыі шлюбна-сямейных адносін у надзвычайных умовах вайны.

Значны фактычны матэрыял ілюстрацыйнага характару аб становішчы жанчын Беларусі ў перыяд вайны ўтрымліваецца ў шэрагу калектыўных прац, падрыхтаваных Інстытутам гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Інстытутам гісторыі

АН БССР [12]. Тым не менш, грунтоўныя комплексныя даследаванні па гэтай праблеме ў беларускай савецкай гістарыяграфіі адсутнічаюць.

Такім чынам, савецкімі даследчыкамі быў уведзены ў навуковы абарот значны фактычны матэрыял па гісторыі жанчын ў беларускім грамадстве перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Былі дасягнуты пэўныя поспехі ў распрацоўцы пытанняў баявой і масава-палітычнай актыўнасці жаночага насельніцтва рэспублікі ў партызанскім руху і партыйна-камсамольскім падполлі. Аднак абумоўленае ідэалагічным уплывам кан'юктурнае асвятленне праблем вайны 1941-1945 гг. і манапалізм марксісцкай метадалогіі ў даследаваннях па гісторыі жанчын не дазволілі савецкім навукоўцам усебакова і аб'ектыўна адлюстраваць становішча жанчын Беларусі ў ваенны перыяд. Па-за ўвагай савецкіх гісторыкаў засталіся рэальныя цяжкасці ваеннай паўсядзённасці, з якімі прыйшлося сутыкнуцца жанчынам на фронце і ў эвакуацыі; жыццё жанчын на акупіраванай тэрыторыі Беларусі і іншыя праблемы, якія свядома замоўчваліся ці на іх даследаванне была накладзена забарона. Не вывучанымі засталіся псіхалагічныя аспекты феномену масавага гераізму жанчын, уплыў вайны на змяненні сацыяльнага статусу жанчын ў пасляваенным грамадстве. Між іншым, гэтыя праблемы ўжо з пачатку 80-х гг. XX стагоддзя аказаліся ў цэнтры ўвагі замежных даследчыкаў, якія працавалі ў галіне жаночай і гендэрнай гісторыі. У сучаснай нацыянальнай навуцы гісторыя жанчын Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны пакуль не знайшла свайго даследчыка. Таму на сённяшні дзень уяўляецца неабходным і актуальным, абапіраючыся на напрацоўкі замежных даследчыкаў і ўлічваючы вопыт савецкай гістарычнай думкі, з новых тэарэтыка-метадалагічных пазіцый прааналізаваць становішча жанчын рэспублікі ва ўмовах ваеннага часу.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Захаревич П.Б., Бучинская К.В.*** Советская женщина в Великой Отечественной войне. Аннотированный указатель литературы. М., 1944. – 36 с.
2. ***Савіцкая Я.*** Савецкая жанчына ў Вялікай Айчыннай вайне // Большавік Беларусі. 1946. № 3. С. 54-61.
3. ***Ус А.П.*** Што дала Кастрычніцкая рэвалюцыя жанчынам Беларусі. Мн., 1958. – 40 с.
4. ***Мурманцева В.С.*** Советские женщины в Великой Отечественной войне: 1941-1945. 2-е изд., перераб. и доп. М., 1979. – 293 с.
5. ***Митрофанова А.В.*** Советские женщины в защите социалистического Отечества // Национальный аспект решения женского вопроса в СССР. Ташкент, 1978. С. 33-51.
6. ***Кондакова Н.И.*** Участие женщин в защите социалистического Отечества // Опыт КПСС в решении женского вопроса / ***Н.И. Кондакова, Н.И. Дубинина, Я.С. Мазурова и др.*** М., 1981. С. 103-127.
7. ***Гребенкина А.*** Героические защитницы Родины // Коммунист Белоруссии, 1975, № 3. С. 40-46.
8. ***Протченко В.З.*** Боевой подвиг белорусских партизанок (1941-1945 гг.) // Вопросы истории КПСС: Межвед. сб. Мн., 1976, Вып.7. С. 59-68.
9. ***Языковіч Э.Ф.*** Жанчыны Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне // Весці Акад. навук Беларускай ССР. Сер. грамад. навук, 1976, № 2. С. 17-22.
10. ***Черноглазова Р.*** Женщины Белоруссии в Великой Отечественной войне // В борьбе и труде. Сб. / Под ред. ***Т.Т. Дмитриевой и В.И. Беляецева.*** 2-е изд., доп. и перераб. Мн., 1977. С. 217-243.
11. ***Ваньшина В.И.*** Ратный подвиг советских женщин в годы Великой Отечественной войны: (Материал в помощь лектору). Мн., 1989. – 19 с.
12. ***Всенародная борьба против немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941-1945)***: В 3 т. / ***А.Т. Кузьмин*** (пред.) и др. Мн., 1983-1985. Т. 1-3.

*S U M M A R Y*

*The article deals with the Soviet historiography of the status of Belorussian women during the Great Patriotic War. The author comes to the conclusion that the predominance of marxist methodology and the ideology dictate significantly limited the researches of Soviet historians. Therefore, at present it is necessary to look at the problem from new methodological position.*